4. Макаров, А. В. Проектирование стандартов высшего образования нового поколения: компетентностный подход // Вышэйшая школа. – 2006. – № 5.– С. 13–20.

5. Болонский процесс: середина пути / под науч. ред. д-ра пед. наук, профессора В. И. Байденко. – Москва : Исследовательский центр проблем качества подготовки специалистов, Российский Новый Университет, 2005. – 379 с.

6. Зимняя, И. А. Компетентность человека – новое качество результата образования // Проблемы качества образования : материалы XIII Всероссийского совещания. Кн. 2. Компетентность человека – новое качество результата образования. – Москва ; Уфа : Исследовательский центр проблем качества подготовки специалистов, 2003. – С. 4–15.

7. Лайл, М. Компетенции на работе / М. Лайл ; пер. с англ. – Москва : HIPPO, 2005. – 384 с.

**Abstract.** The questions of social and personal competencies formation of a technical University graduate are considered. The problems of their formation are described.

УДК 378.01:811.161.3

**Занкавіч А.П.,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
**Смалянка Г.А.,** старшы выкладчык
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ДА ПЫТАННЯ АБ СПЕЦЫФІЦЫ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)» У ТЭХНІЧНАЙ УСТАНОВЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

***Анатацыя**. У артыкуле разглядаюцца пытанні, звязаныя з асаблівасцямі выкладання нацыянальнай мовы ў тэхнічнай ВНУ. Аналізуюцца метады і прыёмы працы выкладчыка.*

Репозиторий БГАТУ

Змяняюцца палітычныя думкі і ідэалагічныя тэорыі, пастаянна рэфармуецца адукацыйная сістэма, але яшчэ з часоў Сакрата і Платона задача навучання нязменная: выхаваць гарманічна развітую асобу, падрыхтаваць яе да актыўнага самастойнага жыцця.

У сувязі з гэтым мова была і застаецца прыцягальным аб'ектам увагі ўсіх педагогаў: ці вядзем мы размову пра стан нашай эканомікі, ці распавядаем пра будучае зямлі беларускай – мы заўседы карыстаемся мовай, вуснай і пісьмовай.

Сёння ва ўмовах узрастаючага патоку навуковай інфармацыі асобую актуальнасць набывае фарміраванне інфармацыйнай культуры, якая заключаецца не толькі ў магчымасці хутка выбіраць патрэбную інфармацыю, але і ва ўменні яе лагічна асэнсоўваць і інтэрпрэтыраваць, граматна і аргументавана перадаваць. Такое ўменне ў значнай ступені абумоўліваецца добрай моўнай падрыхтоўкай.

Прызнанне мовы галоўным інструментам інфармацыйнага ўздзеяння, павышэнне матывацыі публічнай маўленчай дзейнасці патрабуюць ад вышэйшай школы рыхтаваць не проста спецыяліста, а камунікатыўна развітую асобу, білінгвістычна падрыхтаваную, якая б на дастаткова высокім узроўні магла наладжваць зносіны ў прафесійна-справавой сферы. Таму ў ВНУ Рэспублікі была ўведзена дысцыпліна“Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, асноўная задача якой – аваладанне беларускай мовай як сродкам зносін і інструментам пазнання ў галіне навукі і тэхнікі, паглыбленне ведаў пра беларускую мову як дынамічную і адкрытую сістэму, пра нацыянальную спецыфіку ў гэтай галіне; выхаванне адносін да слова як скарбніцы духоўнай і інтэлектуальнай культуры беларусаў.

Адукацыйна-выхаваўчае значэнне курса “Беларуская мова (прафесійная лексіка)” акрэсліваецца разнастайнымі сацыяльнымі функцыямі мовы ў грамадстве. Мова выступае як асноўны сродак зносін і пазнання рэчаіснасці. Дзякуючы мове, асоба засвойвае формы чалавечых узаемаадносін, пазнае маральныя і культурныя каштоўнасці свайго народа. Забяспечваючы моўную адукацыю, неабходна ствараць умовы для інтэлектуальнага, эмацыянальнага і духоўнага развіцця асобы, рыхтаваць студэнтаў да прафесійнай дзейнасці і актыўнага грамадскага жыцця, а таксама садзейнічаць таму, каб агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці культуры сталі набыткам асобы.



Репозиторий БГАТУ

Праца выкладчыка накіравана перш за ўсё на тое, каб студэнты ў належнай ступені асэнсавалі той факт, што мова не проста этнічная прымета, а асноўны элемент духоўнай культуры, фальклору, літаратуры, рэлігіі, філасофіі, мастацтва і г. д., што гэта не абстрактная навука або дысцыпліна, якую неабходна здаць як абавязковы мінімум. Бясспрэчным застаецца той факт, што ў свеце няма мацнейшай сілы ўздзеяння на чалавека, чым тая, якую нясуць мова і культура народа, спрыяючы станаўленню інтэлектуальнага, нацыянальна-культурнага і патрыятычнага аблічча грамадзяніна сваёй краіны.

Прынцыпы развіццёвага навучання вымушаюць праяўляць на занятках ініцыятыву, браць на сябе адказнасць, прапаноўваць свае меркаванні вырашэння праблем і г.д. Выкарыстанне актыўных форм навучання накіравана на:

– актывізацыю дзейнасці кожнага студэнта, яго творчай самастойнасці, павышэнне адказнасці за вынікі працы;
– выхаванне цікавасці да прадмета;
– павышэнне ролі ведаў як магчымасці вырашэння практычных (жыццёвых) задач;
– стварэнне атмасферы супрацоўніцтва;
– актывізацыю маўленчай дзейнасці студэнтаў.

На выкладчыка ўскладваецца вялікая адказнасць за фарміраванне высокамаральнай творчай асобы з высокім узроўнем культуры і нацыянальнай самасвядомасці, здольнай дзейнічаць у інтарэсах свайго народа. На занятках павінен прысутнічаць і патрыятычны элемент. Не апошнюю ролю ў гэтым адыгрывае правільны падбор матэрыялу.

Належнае месца займае такі від працы студэнтаў, як падрыхтоўка рэфератаў, што ўключаюць шырокі тэматычны спектр патрыятычнай накіраванасці. Абарона рэферата можа суправаджацца дыскусіяй.

Неабходна навучыць лагічна, паслядоўна, аргументавана, тактоўна выказваць сваю ўласную думку, слухаць іншых, весці дыспут і г.д.

Узровень валодання мовай павінен забяспечваць рэалізацыю камунікатыўных патрэб будучага сучаснага спецыяліста ў сферы прафесійных і службовых адносін. Адсюль і новыя патрабаванні да заняткаў, адно з якіх – своеасаблівы практыкум выкарыстання разнастайных моўных і маўленчых сітуацый.



Репозиторий БГАТУ

Хацелася б, каб кожны выкладчык усвядоміў, што мова – гэта не толькі навукова-тэарэтычны навучальны прадмет. Мы павінны навучыць успрымаць мову і карыстацца мовай як сродкам зносін, пры гэтым мова, пісьмовая і вусная – прыкмета, па якой мяркуюць (і меркавалі ва ўсе часы!) аб узроўні культуры чалавека, яго інтэлекце, сацыяльнай прыналежнасці.

**Abstract.** The article deals with the issues related to the study of language disciplines in the higher educational establishments of technical profile.

УДК 159.98

**Толкач И.Ф.,** кандидат искусствоведения, доцент
*УО «Белорусский государственный аграрный технический университет», г. Минск, Республика Беларусь*

## ТОЛЕРАНТНОСТЬ В ОБЩЕНИИ СТУДЕНТОВ ИНЖЕНЕРНЫХ СПЕЦИАЛЬНОСТЕЙ

***Аннотация.*** *Изучены особенности общей коммуникативной толерантности будущих инженеров. Выявлены толерантные и интолерантные установки студентов. Диагностирован средний уровень толерантности в общении.*

Коммуникативная компетентность является одной из важнейших компетенций, необходимых для специалистов любых направлений деятельности. Способность устанавливать и поддерживать контакты в современных социально-экономических условиях является ключевым навыком как для специалистов, работающих с людьми, так и специалистов, работающих с техникой. Этим обусловлен интерес к данному вопросу.

Изучение коммуникативной толерантности студентов проходило с помощью методики В. В. Бойко «Поведенческие признаки коммуникативной толерантности» [1]. 45 суждений, используемых в методике, разбито на 9 шкал. Каждое из суждений оценивается от 0 до 3 баллов (0 – совсем неверно, 1 – верно в некоторой степени, 2 – верно в значительной степени, 3 – верно в высшей степени), про-



Репозиторий БГАТУ